лёсаў. Паказальным стаў твор «У першым баі». У ім акрэслілася тэма трагічнага франтавога лёсу маладых афіцэраў і салдат. Лёс чалавека складваецца ва ўмовах ваенных падзей, якія суправаджае экстрэмальнасць выканання баявой задачы – гэта знайшло мастацкае адлюстраванне ў аповесцях «Трэцяя ракета», «Пастка», «Праклятая вышыня», «Мёртвым не баліць», «Дажыць да світання». Псіхалагічная насычанасць пагранічнай сітуацыі характэрна для быкаўскіх твораў «Альпійская балада» і «Сотнікаў» («Ліквідацыя»). Пісьменніка ўразіла эвалюцыя цывілізаванай культуры да антыгуманізму ў форме ідэалогіі фашызму. Прадметам псіхааналітычнага разгляду сталі тыя, што знішчалі людзей, і тыя, хто стаў ахвярай антыгуманізму (творы «Кар'ер», «У тумане», «Аблава», «Сцюжа»). В. Быкаў пад уражаннем катастрафізму быцця чалавека і яго духоўнай моцы ва ўмовах нігілізму выпрацаваў філасофска-алегарычны стыль творчасці, ён актуалізаваў дамінанту гуманізму ва ўмовах пастаяннай рызыкі, звязанай з дэградацыяй грамадства.

Такім чынам, Янка Купала і Якуб Колас сталі каардынатарамі творчай дзейнасці новай літаратурнай эпохі. Іх пасіянарныя асобы сваёй глыбіннай духоўнай існасцю ўмацоўваюць нацыянальную экасістэму.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. І. Я. Навуменка, В. А. Каваленка. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: 1901–1920. – 583 с.
2. Лойка, А. Паэзія і час: літ.-крытыч. арт., творч. партрэты / А. Лойка. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 254 с.


*УДК 378.4(476)(091):821.161.3.09(092)Купала, Колас*

## РОЛЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА Ў СТВАРЭННІ І СТАНАЎЛЕННІ БДУ


**А. І. Бельскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*a_belsky@tut.by*


У артыкуле асэнсоўваюцца роля і значэнне Янкі Купалы і Якуба Коласа ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і на этапе станаўлення гэтай першай вышэйшай нацыянальнай установы адукацыі, прыводзяцца звесткі пра сувязі і кантакты паміж знакамітымі пісьменнікамі і БДУ.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; Якуб Колас; БДУ; адукацыя; студэнты; святкаванне; выступленні; чытанне вершаў.

## THE ROLE OF YANKA KUPALA AND YAKUB KOLAS IN THE CREATION AND FORMATION OF BSU


**A. I. Belski**

*Belarusian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*a_belsky@tut.by*


The article comprehends the role and significance of Yanka Kupala and Yakub Kolas in the creation of the Belarusian State University and at the stage of formation of this first higher national educational institution, provides information about the connections and contacts between famous writers and BSU.

*Key words:* Yanka Kupala; Yakub Kolas; BSU; education; students; celebration; speeches; poetry reading.

Народныя паэты Беларусі, акадэмікі Янка Купала (1882–1942) і Якуб Колас (1882–1956) маюць непасрэднае дачыненне да стварэння першай вышэйшай навучальнай установы ў нашай краіне – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ), які быў заснаваны ў 1921 г. у Мінску паводле пастановы Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ) ад 25 лютага 1919 г.

Найбольш поўнае ўяўленне пра кантакты Янкі Купалы і Якуба Коласа з БДУ даюць летапісы іх жыцця і творчасці [4; 5], на гэтыя крыніцы мы і будзем абапірацца ў далейшым. Сціслая хроніка, якая адлюстроўвае дачыненні знакамітых пісьменнікаў з першым нацыянальным універсітэтам, змешчана ў зборніку «Народныя песняры», падрыхтаваным і выдадзеным да 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа [10]. Інфармацыя пра БДУ ў сувязі з біяграфіяй народнага паэта пададзена ў энцыклапедыі «Янка Купала» [12].

Увогуле кажучы, імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю першага беларускага ўніверсітэта [9, с. 98]. Праўда, найчасцей у выданнях пра БДУ згадваецца Якуб Колас як адзін з першых універсітэцкіх выкладчыкаў [гл., напрыклад: 1, с. 6, 33], а імя Янкі Купалы, на жаль, не фігуруе.

Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) – адзін з ініцыятараў адкрыцця БДУ. Ён ад самага пачатку падтрымліваў цесныя кантакты і сувязі з першай вышэйшай нацыянальнай установай Беларусі. Янка Купала быў асабіста знаёмы і неаднойчы сустракаўся з першым рэктарам БДУ Уладзімірам Іванавічам Пічэтам (1878–1947), добра ведаў першых універсітэцкіх выкладчыкаў Івана Іванавіча Замоціна, Мікалая Андрэевіча Янчука, Яўгена Іванавіча Барычэўскага, Аляксандра Мікалаевіча Вазнясенскага, Міхаіла Мікалаевіча Піятуховіча, Адама Антонавіча Бабарэку і інш. Імя Янкі Купалы фігуруе ва ўніверсітэцкіх справаздачах за 1922–1923 гг. Разам з вучонымі БДУ паэт удзельнічаў у стварэнні Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта) – першай навуковай установы, адкрыццё якой адбылося ў 1922 г. У тым жа 1922 г., 19 сакавіка, адбылася святочна-ўрачыстая падзея: «У актавай зале БДУ ўрачыстае пасяджэнне з нагоды 40-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы. Адкрыў рэктар У. Пічэта, які сказаў, што “Купала для беларускай літаратуры тое ж, што Шаўчэнка – для ўкраінскай, і Міцкевіч – для польскай”. Даклады пра жыццё і творчасць юбіляра зрабілі М. Піятуховіч, А. Вазнясенскі і С. Кацэнбоген. Студэнт М. Зарніца прачытаў верш “Вялікаму песняру Бацькаўшчыны”. Я. Купала прачытаў верш “Перад будучыняй”» [4, с. 159].

22 лістапада 1925 г. на педфаку БДУ адбылася вечарына, прымеркаваная да 20-годдзя літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. З дакладамі пра творчасць паэта выступілі прафесары М. М. Піятуховіч і А. М. Вазнясенскі. Прафесар П. А. Бузук, які на той час нядаўна пераехаў у Мінск з Адэсы і пачаў працаваць у БДУ, вітаў юбіляра на ўкраінскай мове. Янка Купала чытаў свае паэтычныя творы. Студэнцкую моладзь ён вітаў вершам «Арлянятам»:

Гэй, узвейце сваім крыллем,
Арляняты, буйна, бурна
На мінулых дзён магіле,
Над санлівасцю хаўтурнай!.. [4, с. 173].

Янка Купала ў 1920-я гг. з маладых паэтаў вылучаў найперш Міхася Чарота, які быў ініцыятарам стварэння і кіраўніком першай у Беларусі літаратурнай арганізацыі «Маладняк». Сёмага сакавіка 1925 г. на рабфаку БДУ была наладжана літаратурная вечарына, прысвечаная Янку Купалу і Міхасю Чароту. Прагучалі даклады пра іх творчасць, вершы ў гонар паэтаў. Янка Купала выступіў з чытаннем уласных вершаў.

Народны паэт 31 кастрычніка 1926 г. прысутнічаў на ўрачыстым пасяджэнні ў БДУ, прысвечаным 25-годдзю навуковай дзейнасці рэктара У. І. Пічэты, пра што паведамляла газета «Звязда» за 2 лістапада.

У сакавіку 1929 г. Янка Купала і Якуб Колас выкладчыкамі і студэнтамі БДУ вылучаны дэпутатамі ў Мінскі гарадскі савет.

У сувязі з юбілейнай датай – 25-годдзем з пачатку літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы (1930) – Народны камісарыят асветы БССР устанавіў стыпендыю імя паэта на літаратурным аддзяленні педфака БДУ.

Янка Купала 23 красавіка 1933 г. разам з Якубам Коласам, Міколам Хведаровічам і іншымі выступіў на літаратурнай вечарыне ў БДУ, якая была прысвечана гадавіне пастановы ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Ён прачытаў новыя вершы.

13 кастрычніка 1936 г. у актавай зале БДУ Янка Купала выступіў з чытаннем твораў. У літаратурнай вечарыне бралі ўдзел пісьменнікі Масквы, Беларусі, Украінскай ССР, Смаленскай вобласці [4, с. 179, 194, 198–199, 212, 240].

У даваенны і пасляваенны час вучонымі БДУ даследаваліся жыццё і творчасць Янкі Купалы [7]. Яму прысвечаны шэраг выданняў: студэнцкі альманах «Маладыя сілы» (1951; кіраўнік Ю. С. Пшыркоў), «Народныя песняры» (1972; склад. і рэд. І. Я. Навуменка), «Песні беларускай валадар» (1981; склад. і рэд. А. А. Лойка), «Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур» (1982), «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (2007, да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа; пад агул. рэд. І. С. Роўды, рэдкал.: Т. І. Шамякіна і інш.), «Мова – літаратура – культура» (2012; да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, пад агул. рэд. Т. І. Шамякінай) і інш. Алег Лойка напісаў і выдаў раман-эсэ пра Янку Купалу «Як агонь, як вада…» (1982; дапрац. выд. – 1992). У навуковых зборніках і перыядычных выданнях надрукаваны шматлікія працы і артыкулы выкладчыкаў БДУ.

На радзіме паэта ў Вязынцы ладзіцца традыцыйны злёт студэнтаў БДУ, арганізатарам якога выступае філалагічны факультэт.

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) – адзін з першых выкладчыкаў БДУ, ён браў непасрэдны ўдзел у станаўленні філалагічнай адукацыі ва ўніверсітэце. Колас разумеў неабходнасць падрыхтоўкі будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры. З 3 лістапада 1923 г. Канстанцін Міхайлавіч пачаў выкладаць на педагагічным факультэце, а 3 снежня быў зацверджаны на пасадзе дацэнта БДУ, на якой працаваў да сярэдзіны студзеня 1926 г. Якуб Колас быў знаёмы з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. І. Пічэтам з 1921 г., яны разам бралі ўдзел у стварэнні Інбелкульта. Універсітэту былі патрэбны новыя і высокакваліфікаваныя спецыялісты, рэктар сам займаўся падборам кадраў. Педагагічнаму факультэту патрабаваўся выкладчык методыкі беларускай мовы. У. І. Пічэта прапанаваў Якубу Коласу працу ў БДУ, і пісьменнік у верасні 1923 г. напісаў заяву ў прадметную камісію на імя І. І. Замоціна і быў прызначаны асістэнтам на кафедру беларускай мовы. Якуб Колас выкладаў і адначасова распрацоўваў методыку беларускай мовы як педагагічнай навукі і дысцыпліны. У 1926 г. пабачыла свет першае выданне «Методыкі роднае мовы».

Захаваліся ўспаміны і сведчанні пра Коласа-педагога яго былых студэнтаў. М. І. Жыркевіч, беларускі мовазнавец, метадыст, заслужаны дзеяч навукі БССР, згадваў: «Студэнты ў аўдыторыі чакалі выкладчыка мовы К. М. Міцкевіча. Не ўсе ведалі, што гэта будзе Якуб Колас. Сустрэлі мы яго з вялікай радасцю. Перад намі быў выдатны майстар слова, вядомы беларускі пісьменнік. Заняткі па роднай мове, методыцы правядзення іх адразу захапілі нас. Ён вёў іх так, што мы адчулі мастацкасць, прыгажосць і сілу роднага слова. Мову беларускую мы вывучалі з вялікай ахвотаю, заўсёды старанна рыхтаваліся да заняткаў. Часта студэнты звярталіся да Канстанціна Міхайлавіча з просьбай прачытаць свае новыя творы. Наш любімы настаўнік задавальняў просьбу. Чытаў ён выразна, з натхненнем. Гэта быў узор таго, як трэба карыстацца мастацкім словам, даносіць яго да слухача. Якуб Колас ухваляў і заахвочваў імкненне нашых маладых пісьменнікаў да вучобы. Дарэчы, Колас дапамог паступіць ва ўніверсітэт маладнякоўцу Паўлюку Трусу, якога лічыў самабытным даравітым хлопцам. Частым госцем і сваім чалавекам быў Колас у інтэрнацкіх пакоях студэнтаў. Па-бацькоўску распытваў ён пра матэрыяльнае становішча, зусім не чураючыся пазычыць дзясятку-другую, кажучы з усмешкай: “Аддасцё, калі заробіце”» [цыт. паводле: 2, с. 141–142]. І. В. Гутараў, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры рускай літаратуры БДУ ў 1951–1957 гг., добра запомніў аблічча класіка і яго манеру трымацца: «...Гаварыў Якуб Колас ціха, павольна, ласкава, але з вельмі багатай, задушэўнай інтанацыяй у

голасе і тонкімі адценнямі ў міміцы. Лоб, бровы, вочы, нават губы і шчокі яго нібы змяняліся ў адпаведнасці з характарам думкі, станавіліся больш сціснутымі, напружанымі ці больш павольнымі, мяккімі. Асабліва яскрава назіралася гэта ў тыя хвіліны, калі мы выконвалі якое-небудзь практыкаванне па беларускаму правапісу, а наш настаўнік у задуменні прыпыняўся ля акна невялікай аўдыторыі.

Часам па нашай просьбе Якуб Колас замест тлумачэння лінгвістычных законаў чытаў нам урыўкі са сваіх твораў...» [цыт. паводле: 3, с. 94].

У 1924 г. Якуб Колас прымаў уступныя экзамены па беларускай мове ў абітурыентаў БДУ. У тым жа 1924 г. ён разам з Максімам Гарэцкім стварылі гурток беларускай культуры на рабфаку БДУ. Гурткоўцы наведвалі заняткі з удзелам вядомых беларускіх дзеячаў, на пасяджэннях разбіраліся творы маладых аўтараў.

Якуб Колас быў частым выступоўцам і госцем у БДУ, яго тут віталі і ўшаноўвалі. У 1922 г. факультэт грамадскіх навук правёў урачыстае пасяджэнне, прысвечанае святкаванню 40-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. З уступным словам выступіў рэктар універсітэта У. І. Пічэта. З дакладамі, прысвечанымі жыццю і творчасці Якуба Коласа, выступілі У. Ігнатоўскі, М. Піятуховіч, Я. Лёсік. 13 кастрычніка 1936 г. у гонар народнага паэта ў БДУ адбылася літаратурная вечарына, на якой яго віталі Янка Купала, Пятрусь Броўка, Андрэй Александровіч, Аркадзь Куляшоў, Аляксей Суркоў і інш. Выкладчыкі і студэнты БДУ 24 лістапада 1946 г. наладзілі святкаванне 40-годдзя творчай дзейнасці Якуба Коласа. Юбіляра прывітаў рэктар БДУ П. П. Савіцкі, дацэнты ўніверсітэта М. І. Жыркевіч і М. Р. Ларчанка, прагучалі вершы, прысвечаныя беларускаму песняру [5, с. 149, 347, 752].

У лістападзе 1952 г. з нагоды 70-гадовага юбілею Якуба Коласа ўшаноўвалі на ўрачыстым сходзе студэнтаў, выкладчыкаў БДУ і Мінскага педагагічнага інстытута. З дакладам пра жыццё і творчасць народнага паэта выступіў Ю. С. Пшыркоў, ад імя студэнцкай моладзі юбіляра вітаў Алег Лойка. Якуб Колас у канцы сходу прачытаў свае вершы. Адзначаючы сваё 70-годдзе ў сценах БДУ, Якуб Колас звярнуўся да студэнтаў са словамі, якія ўспрымаюцца як духоўны запавет класіка, вялікага сына Беларусі (апрача іншага, прамаўляліся яны і ў духу таго савецкага часу): «Дарагія таварышы, студэнты і моладзь! У вас ёсць тры бясцэнныя дары, якім я магу толькі пазайздросціць, у той жа час і парадавацца. Першы дар – ваша маладасць, сіла, жыццярадаснасць. Другі дар – прасторныя, шырокія дарогі ў жыцці... Трэці ваш дар... сягоння яго яшчэ няма ў вас, але ён павінен быць, яго вы абавязаны здабыць – вашаю чэснаю, прынцыповаю, адданаю працаю... Гэты ваш дар можа і павінен праявіцца ў мнагагранннай вашай дзейнасці... А для гэтага вам трэба вучыцца і вучыцца, і не толькі ў сценах універсітэта і інстытутаў, але і па-за іх межамі.

Што ён такое, ваш трэці дар? Гэта ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва...

Жыццё наша – бурнае, веснавое разводдзе. Яно не стаіць на месцы, яно развіваецца з дня ў дзень.

Мой запавет вам: ідзіце ў ногу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго. Не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу...» [цыт. паводле: 11, с. 6].

Жыццё і творчасць Якуба Коласа былі заўсёды ў полі зроку вучоных-філолагаў БДУ. Яму прысвяцілі манаграфіі і даследаванні І. І. Замоцін, М. М. Піятуховіч, І. Я. Навуменка, Ю. С. Пшыркоў, А. А. Лойка, Л. І. Фіглоўская, В. В. Казлова, В. П. Рагойша, М. Я. Цікоцкі, В. П. Красней, Ж. Я. Белакурская, У. Н. Радзівонаў, Л. К. Тарасюк і інш. [6]. Сцяпан Александровіч напісаў і выдаў трылогію пра жыццё і дзейнасць Якуба Коласа «Ад роднае зямлі» (1962), «На шырокі прастор» (1972), «Крыжавыя дарогі» (1985). У гонар Якуба Коласа ў БДУ выдадзены шэраг зборнікаў артыкулаў і матэрыялаў навуковых канферэнцый. Выкладчыкі філфака БДУ бяруць удзел у традыцыйных навуковых чытаннях «Каласавіны», якія ладзіць Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

Такім чынам, Янка Купала і Якуб Колас самым непасрэдным чынам спрычыніліся да стварэння і дзейнасці БДУ на першапачатковым, даваенным этапе яго станаўлення і развіцця. Яны ўдзельнічалі ў духоўна-культурным і літаратурным жыцці ўніверсітэта, спрыялі выхаванню новага пакалення беларускай моладзі. Імёны класікаў, народных песняроў залатымі літарамі назаўсёды ўпісаны ў гістарычны летапіс першага ўніверсітэта Беларусі.

## Бібліяграфічны спіс


1. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: да 75-годдзя з дня заснавання БДУ / Беларус. дзярж. ун-т / рэдкал.: П. Д. Кухарчык, А. І. Зелянкоў, А. І. Лесніковіч. – Мінск, 1996. – 65 с.

2. Дарагакупец, А. М. «Не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу...»: Якуб Колас і яго педагагічная дзейнасць у БДУ / А. М. Дарагакупец // Беларус. літаратуразнаўства: навук.-метад. зб. / гал. рэд. Л. Д. Сінькова. – Мінск: БДУ; Паркус плюс, 2010. – Вып. 8. – С. 138–146.

3. Іофе, Э. Якуб Колас – выкладчык вышэйшай школы / Э. Іофе // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 12. – С. 91–95.

4. Летапіс жыцця і творчасці // Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2003. – Т. 9, кн. 2: Дапаўненні да папярэдніх тамоў; Летапіс жыцця і творчасці; Дадатак. – С. 43–282.

5. Мушынскі, М. І. Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа / М. І. Мушынскі; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 1126 с.

6. Літаратуразнаўцы БДУ пра Якуба Коласа / падрыхт. А. І. Бельскі, У. Ю. Верына // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 11.09.2022.

7. Літаратуразнаўцы БДУ пра Янку Купалу / падрыхт. А. І. Бельскі, Г. М. Мятліцкая // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 11.09.2022.

8. Навукова-педагагічная дзейнасць Якуба Коласа ў 20–30-я гг. / Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.kolasmuseum.by › navu... – Дата доступу: 25.02.2021.

9. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 1921–1941 / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі; рэдкал.: В. І. Стражаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2006. – 383 с.

10. Рагойша, В. П. Янка Купала і Якуб Колас у іх сувязях з Беларускім дзяржаўным універсітэтам (хроніка) / В. П. Рагойша, К. Р. Хромчанка // Народныя песняры: да 90-годдзя з дня нарадж. Я. Купалы і Я. Коласа: зб. артыкулаў / пад рэд. І. Я. Навуменкі [і інш.]. – Мінск: Выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1972. – С. 262–271.

11. Універсітэт паэтычны / рэдкал.: А. А. Волк [і інш.]; склад. А. А. Лойка. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1971. – 244 с.

12. Янка Купала: энцыкл. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2017. – Т. 1: А–З. – С. 112–113.


*УДК 378.4(476.6):821.161.3*

# ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ – АДЗІН З ЦЭНТРАЎ КУПАЛАЗНАЎСТВА

**М. У. Грынько**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*
*Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*ngrynko@mail.ru*

У артыкуле асвятляецца дзейнасць Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы як аднаго з цэнтраў купалазнаўства. Звяртаецца ўвага на мерапрыемствы, якія звязаны з ушанаваннем памяці народнага паэта Беларусі. Паказваюцца асноўныя кірункі даследавання творчасці пісьменніка ва ўніверсітэце.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; купалазнаўства; Купалаўскія чытанні.